**Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Любчанская сярэдняя школа”**

**Народны гісторыка-краязнаўчы музей Любчанскага краю**



# Гісторыя аднаго экспаната

**Кіраўнік**:
настаўнік гісторыі Борыс Т.А.
**Выканалі**:
удзельнікі патрыятычнага клуба
“Спадчына”

Любча 2022

***Трэба многа знаць, каб узор прачытаць.***
***Ці светлым сонцам, ці хатнім аконцам,***
***Ці вешчай кукушкай, ці мяккай падушкай,***
***Ці яркаю зоркай, ці ўдавою горкай,***
***Ці спорным святам, ці родным братам,***
***Ці роднай сястрыцай, ці светлай крыніцай,***
***Ці зарой – зараніцай, ці добрай маладзіцай,***
***Ці краснай дзявіцай, ці свежай вадзіцай.***

Гэта праца – гімн адвечнаму імкненню нашых продкаў да прыгожага, няўтольнай празе праз ткань ўзор выказаць сваё разуменне жыцця, свету, космасу, хваласпеў умелым рукам светлай, добрай, паэтычнай душы нашай сялянкі, былой жыхаркі мястэчка Любча – ***Агаф'і Нікіфараўны Грыцкевіч***

# *Уводзіны*

Беларускі ручнік – рэч глыбока сімвалічная, шматзначная. Вышываная, узорыста вытканая тканіна здольна выклікаць шмат пачуццяў і асацыяцый. Створаны па законах мастацтва, ручнік упрыгожвае паўсядзеннасць і адначасова з’яўляецца сімвалічным напамінам аб нябачных сувязях, што знітоўваюць асобнага чалавека з Богам, яго продкамі, яго родам. Ручнік адлюстроўвае гісторыю народа, яго дух, творчыя памкненні, мастацкае светаўспрыманне. Гэта найкаштоўнейшы здабытак беларускай культуры і мастацтва

Невыпадкова з ручнікам асацыіруюцца ўстойлівыя сімвалы – вобразы: ручнік - шлях, ручнік - повязь, ручнік - увасабленне дабра. Гэтыя сімвалічныя вобразы стагоддзямі замацоўваліся ў свядомасці людзей абрадамі і рытуаламі традыцыйнай культуры. Усё, што захавана ў народным ткацтве, не пералічыць, але кожны ўзор сімвалізуе дабро, праўду, прыгажосць, любоў, гонар за чалавека, яго працу, кожны ўзор мае сваё прызначэнне і сваю назву.

У беларусаў, як і ў цэлым у славян, ручнікі займалі асаблівае месца. Можна сказаць, ручнік суправаджаў беларуса ад нараджэння да самай смерці. На ручнік прымалі нованароджанага, ручнікамі аздаблялі покуць у хаце, іх ахвяравалі ў храмы, на ручніку апускалі труну ў магілу і павязвалі яго на магільны крыж. Асабліва шмат прыгожа арнаментаваных рушнікоў уключалася ў вясельны абрад.

Ва ўзорах тканых і вышываных вырабаў зашыфравана гісторыя жыцця людзей і прыроды, гісторыя роднага краю. Ёсць такая легенда. Напрыканцы XII ст. на землі Беларусі абрушылася крыжацкая навала. Крыжакоў на адкрытых прасторах перамагчы было вельмі цяжка, практычна немагчыма. Але нашы продкі, як тыя партызаны, хаваліся ў лесе. Яны слалі ручнікі ў выглядзе сцежкі на балоцістай глебе і заманьвалі туды ворагаў. А ў крыжакоў былі на ботах шпоры, і калі яны праходзілі па гэтых ручніках, то чапляліся шпорамі за іх і падалі. З засады выскаквалі воіны і з лёгкасцю бралі ворагаў у палон.

Канкрэтныя знаходкі ручніка датуюцца перыядам Кіеўскай Русі. Ён быў звычайным для тагачаснага побыту прадметам. Яго ўжо тады арнаментавалі і

заўсёды ставіліся да палатніны з пашанай. Варта прыгадаць кіеўскі скарб, знойдзены ў 1876 г., які складаўся са 120 сярэбраных манет часоў Старажытнай Русі. Без сумнення, яны апынуліся ў зямлі з прычыны татарскай навалы, таму і былі спехам закапаны, абгорнутыя толькі тканінай. Ёю аказаўся вышыты ручнік, сатлелыя рэшткі якога і выцягнулі з глебы разам з манетамі. Шчасліваму захаванню палатніны ў дадзеным выпадку садзейнічала знаходжанне яе са значнай колькасцю металічных, тым больш сярэбраных рэчаў.

Як выглядаў старажытны беларускі ручнік? Ён быў трошкі меншы па сваіх памерах за сучасны, вырабляўся нескладанымі спосабамі ткацтва, а калі арнаментаваўся, то пераважна шыццём. У колеравых адносінах пераважалі шэра-белыя ці прыглушаныя чырвона-карычневыя адценні льнянога прадзіва.

Больш дакладныя звесткі пра беларускі ручнік пакінула Сярэднявечча. Ручнік згадваецца ў дакументах гарадскіх судоў Мінска, Магілёва, Брэста, Гродна, Вільні, Слоніма, Віцебска і іншых гарадоў як адзін з папулярных прадметаў гарадскога і сялянскага побыту. Тады карысталіся простымі ўціральнікамі і ўзорыста вышыванымі ручнікамі з хатняга палатна. Яны складалі пасаг і вясковай, і гарадской дзяўчыны. У той час ручнік набыў адзнакі каштоўнай дэкаратыўнай рэчы і разам з іншымі мастацкімі тканінамі з’яўляўся прадметам гандлю. Тая акалічнасць, што беларусы ведалі ручнікі і блізкіх, і даволі далёкіх заходнееўрапейскіх краін, не перашкаджала ім трымацца свайго ўласнага арнаментальна-каляровага стылю, які адразу ж выдаваў “полотенце шитое литовское”.

Падобны выраб адлюстраваны на гравюры “Ф. Скарына”, змешчанай у Бібліі 1517 − 1519 гг., дзе вядомы асветнік паказаны за маленькім рабочым столікам, пакрытым багата арнаментаваным ручніком. Наяўнасць ручніка, ды яшчэ ў цэнтральнай частцы гравюры, наўрад ці выпадковая. Трэба думаць, наш славуты першадрукар быў добра знаёмы з культурай сваёй зямлі. Таму тканіна на гравюры сканцэнтравана перадае выразныя рысы беларускага ручніка: ромба-геаметрычны арнамент, скампанаванасць яго ў папярочныя палосы, разбеленасць фонам, доўгія махры.




У Народным гісторыка-краязнаўчым музеі Любчанскага краю маецца багатая калекцыя рушнікоў прынёманскай зямлі пад назвай “Повязь часоў”. Узоры, вышытыя на тканых рушніках, - зашыфраваны аповяд пра жыцце жыхароў Любчанскай зямлі, яе прыроду, лад жыцця, звычаі, абрады.




Спынімся на адной, малавядомай ролі ручніка ў народным побыце. Многія майстрыхі “запісвалі” на ручніках свае любімыя песні, і тады ручнікператвараўся ў песню, нібыта маўклівую, але для самой майстрыхі - заўсёды жывую. Вось пра гэты ручнік – песню і пойдзе размова.




Знаходзіцца ручнік – песня сярод іншых экспанатаў калекцыі рушнікой “Повязь часоў”. На першы погляд нічым не прыкметны, але прыцягвае ўвагу год яго стварэння – 1897 год і вышытыя на тканіне ініцыялы – АГ. АГ – гэта імя і прозвішча жыхаркі п. Любча Агаф’і Нікіфараўны Грыцкевіч. Простая сялянка 1865 г.н., выдатная майстрыха, як і ўсе

жанчыны мястэчка доўгімі зімовымі вечарамі прала, снавала ніткі, вышывала, ткала.



Яе ўнучка, Алена Паўлаўна Новік, адна са старэйшых жыхарак Любчы, успамінае:

"Мая бабуля была выдатнай майстрыхай, магла ўсё: і звязаць, і пашыць, і згатаваць. Нарадзілася ў Карэліцкім раёне прыкладна ў 1865 г. Яе бацька і маці мелі 3 га зямлі, вялі гаспадарку. З малога працавала на полі, хадзіла ў заробкі, завіхалася па гаспадарцы. Выйшаўшы замуж у Любчу за Дзмітрыя Макея, нарадзіла сямёра дзяцей. Працы хапала, але знаходзіла час разам з жанчынамі сабрацца разам, паспяваць, патанчыць. А якія ладзіліся вячоркі..! Там вышывалі, шылі, вязалі. Колькі пасля яе засталося ўсяго: і сурвэткі, і посцілкі, і рушнікі. Пры Польшчы сям'я перажыла пажар. Згарэла амаль усё, але раней людзі ў час такой бяды ў першую чаргу выносілі куфар з саматканым, вышываным. Пагэтаму асноўную частку вырабаў ўдалося ўратаваць. На жаль, за столькі гадоў ужо засталося няшмат.



Ручнік усё сваё жыцце захоўвала мая маці - Галынская Вольга Уладзіміраўна. Пад час Вялікай Айчыннай вайны нас эвакуіравалі ў Саратаўскую вобласць, дзе мылі жылі да 1945 г. Дзіўна, але ў такіх складаных умовах маці змагла зберагчы і прывесці назад на Радзіму бабуліны дываны, посцілкі, ручнікі. У быце ручнікі не выкарыстоўвала: берагла як памяць аб сваёй маці. Я змяніла шмат месцаў жыхарства, пакуль абжылася ў Любчы. Але ручнік з ініцыяламі маёй бабулі заўсёды быў са мною – гэта для мяне вялікая каштоўнасць, тым больш, што узор на ім незвычайны, рэдка сустракаецца…"

І сапраўды, сярод ручнікоў з традыцыйнай сімволікай, узор на ручніку Агаф'і Грыцкевіч падаецца незнаёмым і незразумелым. На самой справе гэта

асаблівы від творчасці, ён спалучае ў сабе народную музыку і арнаментальную творчасць. Агаф'я Нікіфараўна выступіла тут і як спявачка, і як мастачка. Ручнік створаны на тэму народнай песні – балады пра тое, як маці атруціла нявестку і сына. Гэта песня вельмі папулярная на Беларусі. Змест песні такі : неўзлюбіла маці нявестку, вырашыла яе атруціць. Ды разам з нявесткаю атруту выпіў і сын. На іх магілах пасадзілі дрэўцы. Выраслі яны, пахіліліся адно да аднаго, перапляліся галінкамі. "І ўсе людзі дзівіліся, што на тым свеце палюбіліся". Вось адзін з яе варыянтаў з шматтомнага акадэмічнага выдання "Беларуская народная творчасць":

*Свякроў нявестку біла-карала,*
*Біла – карала, упроч пагнала.*

- *Ідзі, нявестка, упроч на ўсю цемную ноч,*

*Стань сабе ў полі хоць калінаю*

*Хоць калінаю, хоць чырвонаю*
*Туды мой сынок з вайны будзе ісці.*

*З цябе, каліна, дзівіцца будзе*
*Прыйшоўшы дамоў, хваліцца будзе:*

- *Мамачка мая, родная мая,*

*Увесь свет абыйшоў, такога*
*дзіва нідзе не бачыў:*

*А ў полі, у полі на самай ніве*
*Каліна стаіць, без ветру шуміць*
*На ёй ягадкі без сонца спеюць*

*Пайдзі, сынок, у клець, вазьмі*
*востры меч - Вазьмі каліну ў*
*палавіну.*

*Пайшоў сынок ў клець, узяў востры меч*
*Зрубаць каліну ў палавіну.*

*Секунуў параз – цела белае.*
*Секануў другі- кроў капнула.*
*Секануў трэці – яна мовіла:*

*- Міленькі ты мой , дружына*
*мая. Не рубі мяне – я жана твая*
*Гэта голлейка-косачкі мае,*
*Гэта расіца – слёзачкі мае*
*Гэты ягадкі – дзетачкі твае.*

*Яны селі і паехалі.*
*Ой, выйшла маці дзяцей*
*страчаці.*
*Сыну вынесла зялёна віна*
*Маладой нявесце – белу атруту.*

*Сын віна не піў, пад каня разліў,*
*А белу атруту напалам дзяліў*

*Ой, не ўмела, маці , ты нас*
*пераняці,*
*Дык сумей , маці, нас пахаваці*

*Сына пахавала каля цэркаўкі,*
*А нявестку на другім баку.*

*На сына пасадзіла зялёны*
*дубочак,*
*На маладой нявесце – белу*
*бярозу.*

*Вот раслі яны, пахіліліся*
*Цераз цэркаўку сашчапіліся.*
*На іх людзі падзівіліся,*
*Што яны верна любіліся.*



Галіна з парасткамі – сімвал дзяўчыны. Вобраз добрага малойца таксама паказаны ў выглядзе трохчасткавай кветкі. Чорнае дрэўца пасярэдзіне – сімвал страчанага шчасця. Унізе малюнка – сімвал Зямлі – Карміцелькі. Кветкі чорнага колеру – сімвалы тугі, самоты, гора. Чорныя і чырвоныя крыжы – сімвалы смерці. Усе гэтыя ўзоры прасякнуты тонкай мелодыяй народнай паэтыкі, вобразнасцю мыслення майстрыхі.

Агаф’я Нікіфараўна пайшла з жыцця ў 1940 г. Але пакінула для сваіх нашчадкаў сапраўдныя ўзоры высокага майстэрства, багатага духоўнага свету, шчырай сялянскай працавітасці.

## *Заключэнне*

Здаўна для нашых продкаў праца была асноваю жыцця. А плён гэтай працы з'яўляўся асновай для мастацкай творчасці. Вельмі радасна, што, нягледзячы на бурныя змены гістарычных падзей, уладаў, ідэалогій, захаваліся шматлікія ўзоры народнай творчасці, і сёння яны для нас – невычэрпная крыніца мудрасці і жыццёвага вопыту. За стагоддзі развіцця традыцыйная арнаментыка ўвабрала ў сябе багаты вопыт назірання людзей за прыродай, жыццём, рознымі іншымі з'явамі. І гэты жыццёвы вопыт мы спрабуем сёння расшыфраваць.

З кожным годам застаецца ўсё менш і менш носьбітаў традыцыйнай беларускай культуры. Старэйшыя жыхары пасёлка Любча яшчэ захоўваюць даўнішнія вырабы майстроў прыкладнога мастацтва: вышываныя дываны, саматканыя посцілкі і ручнікі. Але час ідзе… Вельмі хочацца, каб іх дзеці, унукі і праўнукі зразумелі неабходнасць зберажэння гэтых шматзначных рэчаў, гімнаў чалавечай працы, матэрыяльнага ўвасаблення пачуццяў, думак, памкненняў сваіх дзядоў і прадзедаў.